Сяргей Законнікаў

# Сутнасць

Кніга
паэзіі

Мінск
Мастацкая літаратура
1987

www.kamunikat.org

# СВЕДЧУ ЛЁСАМ

## Вершы

* * *

Мы сцежкай дзён сваіх
Зайшлі ў жыццё далёка,
Але шукае слых,
Але пільнуе вока
Скрозь дождж, імжу і снег
Світальны дар вытокаў:
Маленства росны смех,
Адкрыцці першых крокаў.
Вунь хата ўскрай сяла
Раскрыла аканіцы,
І мама падышла
З вядзерцам да крыніцы.
Ты б кінуўся туды,
Каб сцішыцца ў паклопе,
Папіць жывой вады
З прасвечаных далоняў.
Ды тыя дні сплылі
За далягляд, як востраў.
Спрадвеку па зямлі
Жыць і любіць няпроста.
На плечы ціснe час,
Бязлітасны, трывожны.
Ён пе шкадуе пас,
У ім згарае кояшы.
Сцякае лісця медзь
У плынь настылых водаў...
І трэба зразумець,
Што гэта — назаўсёды.

www.kamunikat.org

* * *

Адшчыраваў пчаліным звонам ліпень,
І жнівень вырай на крыло падняў...
Жыццё здаецца не такім вялікім,
Як у маленстве некалі ўяўляў.
Не ведаю: ці доўгі, ці кароткі
Застаўся мне прамежак для быцця,
Але хацеў бы адысці, як продкі,—
Спакойна,
Лёгка,
З верай у працяг.
Жыцця ніколі не бывае многа,
Так як і праўды — колькі ні жыві.
І ёсць адна любоў,
Адна трывога:
Айчына — ты і ў думах, і ў крыві.
Твой жытні хлеб,
Глыток гаючай мовы
І ў вечным сне не страціць, не забыць.
Мяне не будзе, застанецца слова,
Якім хачу заўяеды цябе любіць.
Ніхто не абмінае смерці плаху,
Застыпуць зоркі і ў маіх вачах...
А ты жыві,
Гадуй дзяцей без страху,
Цярпліва доўжы свой
праз вечнасць
шлях.

## ВЕЧНАЯ ДАЛЕЧ

*Генадзю Бураўкіну*

Далеч Беларусі ветравая
Панаўзбоч няспешных бальшакоў...
Зноў яна імкліва наплывае,
Ціснецца ў душу з усіх бакоў.
Хлеба,
Волі,
Памяці дыханне
На сваім крыле абсяг прынёс,
Каб не прападала адчуванне,
Што сатканы з іх навечна лёс.
Капне на запылены трыпутнік
Ціхая дажджынка ці сляза.
Што памкнуўся ўсіх часоў пакутнік
Толькі аднаму табе сказаць?
Хто лісцінку ў жылках цёплых, белых —
Болю і любові стойкі сплаў —
Да душы зняможанай, знямелай,
Як далонь ласкавую, прыклаў?
Дня расце высокая званіца,
Растае ў нябёсах спакваля.
Нейкую святую таямніцу
Прыхавала родная зямля.
Ходзіць полем вецер асцярожны,
Звоніць жыта маладая медзь.
Хочацца на камень прыдарожны
Сесці і да забыцця — глядзець...
Глядзець...

* * *

Ад ліўня пачарнелі стрэхі хат,
За ўзлескам гром знясілены сканаў...
Стаіць на ганку той вайны салдат,
Ён «прыміну» ў сухія вусны ўзяў.
Зацяжкі франтавое гарката
Вярэдзіць да крыві яго душу.
Была няшчадпай па бядзе вярста,
Назад прынёс адну руку — ляўшу.
Боль не праходзіць.
Ці лягчэй ясывым,
Чым тым,
што спяць пад зоркай
за сялом?
І хмара,
што плыве,
як дым,
над ім,
Чапляе чуб сівы
сваім крылом.

**ПЕРАКУР**

Стары цясляр адкінуў трэску,
Паволі разагнуў спіну,
Цяжкой рукою звыкла, рэзка
Сякеру ў вугал удзяўбнуў.
Зірнуў на ціхія прысады,
На недакошаны лужок,
Дастаў бляшанку з самасадам,
«Раёнкі» адарваў шматок.
Свяцілася смалой бярвенне,
Вянцы — як поціск моцных рук.
Скакаў у зрубе ў нецярпенні,
Нібы шпачок, маленькі ўнук.
Стары ўсміхаўся: «Зараз, зараз...
Паспееш, жэўжык. Бач ты іх...»
А потым аж змяніўся з твару
І на паўслове раптам сціх.
Малы уходання не ведаў,
Давіўся горкімі слязьмі:
«Чаго маўчыш? Ты чуеш, дзеду?
Хутчэй мяне к сабе вазьмі!»
А дзед сядзеў...
Сам ледзь не плакаў,
Глядзеў з журбой на хлапчука...
Растрэсла ўпершыню табаку
Яго дрыжачая рука.

* * *

Званок сярод ночы.
— Я слухаю вас...
У трубцы — дыхапне, маўчанно.
— Хто звоніць? Алё! Дайце ўсё-ткі адказ!
Я слухаю вас... Я слухаю вас...
Маўчанне...
Іду ставіць чайнік.
Глядзеу на пліту, дзе сіпаты агонь
Расцвіў, як блакітная кветка.
Дык быў той званок ці прыдумаў яго?
Што быў ён, хто будзе за сведку?
Ну што ж.
Усё роўна цяпер не засну,
Душу абцяжарыла вусціш.
І чай, што паволі я з кубка цягну,
Як сівер, абпальвае вусны.
Каму ж я патрэбен?
У цішы начной
Трывожныя думкі прыходзяць.
Спіць жонка, спяць дзеці мае за сцяной.
Суцішся, паблазніў, дый годзе.
Званок.
Зноў бягу, пачынаю крычаць.
У трубцы маўчаць. Я ў адчаі...
І раптам знайшоў на званкі свой адказ —
То дыхае час, то слухае час.
Маўчанне... дыханне... маўчанне...

## НАВАЛЬНІЦЛ

Прыхоплівае ўскраек хмары
Маланкі вогненнае шво.
Трасецца ад глухіх udараў
Лясоў зялёнае брыво.

У вербах вецер ломіць крылы,
У пояс гнуцца нараты —
То з долам высь загаварыла,
І дыялог у іх круты.

Гляджу,
І думка хваляй б'ецца:
— Пярун не страшны... А калі?
Ракет чужых гайня ўзаўецца,
І скончыцца жыццё Зямлі.

Грымоты змоўклі,
Сціхнуў вецер,
А сэрца грукае ў рабро...
На ўсім,
          што дзееццa на свеце,
Стагоддзя грознага таўро.

www.kamunikat.org

* * *

*Васілю Быкаву*

Усё было, але сваёй гісторыі
Ні кропелькі на здзек я не аддам.
За свет,
што потам і крывёю створаны,
Адказваю без агаворак сам.
Усё было, ды шлях які агораны,
Ты толькі зрэдку кінь пагляд пазад!
Разведка боем — гэты шлях нятораны,
А бой не абыходзіцца без страт.
Усё было, але варункі розныя
Мы сэрцам пераплавілі сваім.
Запозненай не трэба асцярожнасці
Аднолькава —
ні мёртвым,
ні жывым.
Хоць часам праўда
прад маной
і гнулася,
Ды не на гэтым белы свет стаіць...
Тым,
хто спрабуе
паднавіць мінулае,
У будучым няма чаго рабіць.

* * *

Гараць чырвоныя каліны,
Святло ўзыходзіць ад зямлі.
У небе крохкім, жураўліным
Журботна гукі паплылі.
Гучаць сярэбраныя горны,
Лёт набірае гонкі клін.
Ён далячынь душы прасторнай
Рассек на яву і ўспамін.
Спяшае кожны ў век дарослы
Сваёй наіўнасцю сляпы,
Пакуль не замільгаюць вёсны,
Як прыдарожныя слупы.
І прыйдзе раптам з ціхім болем
Зямная ісціна адна —
Гады не вернуцца ніколі,
Хоць кліч іх з ранку да цямна.
Ды лёс нявварта вінаваціць,
Што сірацее чарада,
Што волю не бярог, а траціў...
Тваё жыццё, твая бяда.
Гараць чырвоныя каліны,
Якім не раз яшчэ цвісці.
А мне пад небам жураўліным
У далеч вусцішна ісці.
То хваляю любові строгай,
То скразняком нямой тугі
Праз сэрца працячэ трывога
І злучыць долі берагі.

www.kamunikat.org

**ЧАС ПАДЛЁТУ**

Чалавецтва можа жыць на
Зямлі яшчэ 6 мільярдаў гадоў.
*З газет*

На зямлі ёсць спрадвечнае радасці час —
Надыходу вясны, першых птушак сустрэчы.
Ёсць і жалю пара, што злятае на нас
Сумным голасам выраю з гулкай сінечы.
Так жылі,
так падзелены быў каляндар
На прылёт і адлёт,
а між імі — работа...
Ды раптоўна дыхнула пустэчай у твар —
Век ракетны спрасоўвае ўсё ў час падлёту.
Шэсць хвілін увабралі да кроплі ў сябе
Наша сёння, наступныя дні, успаміны...
Стрэлка колецца ў розум, па сэрцы шкрабе,
Стаў звычайны гадзіннік заведзенай мінай.
Не капеж у блакіце крохкім звініць,
Не вераб'і ў калюжынах ціўкаюць,
Гэта на вежах
Еўрапейскіх,
Амерыканскіх,
Афрыканскіх,
Азіяцкіх
Сталіц,
У кабінетах прэзідэнтаў,
Прэм'ер-міністраў,
Чыноўнікаў,
У палацах каралёў,
Шэйхаў,
У бетонных бункерах,
На пультах,
У касмічнай прасторы,
Пад зямлой,
Пад вадой,
У шыкоўных асабняках,
Камунальных кватэрах,
Хацінах,
Фанзах,
Юртах,
Насценныя,
Напольныя,
Настольныя,
Наручныя,
Кішэнныя,
Механінныя,
Электронныя,
Уманціраваныя ў медальёны,
Шарыкавыя ручкі,
Бранзалеткі,
Пярсцёнкі
Гадзіннікі б'юць,
мігаюць,
цікаюць.
Цік-так...
Ці так?
Што будзе?
Чуеце, людзі?
Над зямлёй без супынку ідзе хвіляпад,

www.kamunikat.org

І адкласці жыццё немагчыма на потым,
Бо ніколі ніхто не адкруціць назад
Толькі шэсць, шэсць нядоўгіх хвілін —
час падлёту.
Свецяцца ў вечнасці на ілбе
зоркі, як кроплі поту...
Адкажы мне, Зямля, што чакае цябе?
Час прылёту...
Час адлёту...
Час падлёту...

## РЭХА МАЎЧАННЯ

Іскрыцца іржэўнікам поле,
Брыдуць лугавінай стагі.
Буслы над глухім наваколлем
Адчайныя робяць кругі.

Крылом разганяючы скруху,
Спрабуюць вярнуць добры дзень,
Ды ў зоне —
ні гуку, ні руху,
Упаў на зямлю змрочны цень...

Машыны ў калдобах гайдае,
І пыл, што падняўся з дарог,
На скроні журбой асядае
Усім, хто пакінуў парог.

Увішна праводзіць па колах
Дазіметрам юны салдат,
І доўжыцца шлях невясёлы
У свет ад дзядоўскіх прысад,

А я, захліснуты адзіным
Жаданнем,
вярну з бальшака
Туды -
на малую радзіму
Вялікага палешука.

www.kamunikat.org

У цішы музейнай нямееш,
Здаецца, сядзіць за сталом
З рукою паранепай Мележ,
Як птушка з падбітым крылом.

Сядзіць, вечнай думаю скуты,
Кругі пад вачмі наплылі.
Душу разрываюць пакуты,
Чужое маўчанне зямлі.

І ён не адкажа, што будзе,
Пытальна глыбее пагляд —
Ці вернуцца птушкі і людзі
Да гнёздаў спрадвечных назад?

Даносіцца з нетраў туманных
Праз даўкую чорную быль
Тужліва-адчайнае: «Га-а-н-н-о-о...»,
Пяшчотна-жывое: «Ва-сі-і-ль...»

## КАСЦЁР

*Памяці У. Караткевіча*

Трывожна мне глухой начной парою
Глядзець у неба з прагай адкрыцця,
Хоць зоркі залацістым ціхім роем
Гудуць,
перaліваюцца,
мігцяць.
Пасля ўсяго,
што давялося зведаць,
Раптоўна здасца — там касцёр гарыць.
А да яго ідуць нябачным следам
Мае,
якіх няма ў жывых,
сябры.
Блукаюць блікі па суровых тварах,
На сцятых вуснах — таямнічы знак.
Гукаю іх,
ды немата ўладарыць,
Прабіцца праз яе не змог ніяк.
На досвітку атухне зор вуголле,
Як прысак,
пашарэе Млечны Шлях...
А я хачу пачуць іх смех і голас,
Гучаць яны ў якіх цяпер краях?..

www.kamunikat.org

* * *

Гады аблятаюць, як лісце
З асенніх зажураных дрэў,
Ды ўсё, што ў далёкім калісьці,
Я ў памяці сёння сустрэў.
З паклажай сваёй што ты зробіш,
Што выбераш, каб выкідаць?
Бо нават нязначная дробязь —
Жыццё, а яго мне шкада.
Шкада спеву той калыханкі,
Што мама ласкава вяла.
Яна, нібы ў небе заранка,
Такой маладою была.
Шкада мне сцяжын вечаровых,
Што ў бор праз туманы плылі,
І кветкі купальскай чароўнай,
Якую мы ўсё ж не знайшлі.
Шкада мне студэнцкай сяброўкі,
Гарачых вятроў цаліны.
Чаго толькі лёс ні абрынуў
На плечы, а сняцца яны.
Шкада мне вясёлых вяснушак
Каханай, што ў свеце адна,
І шчэбету дочак-пястушак,
Бо тчэ іхні вэлюм вясна.
Усё, што ў далёкім калісьці,
Я ў памяці сёння сустрэў...
Гады аблятаюць, як лісце
З асенніх зажураных дрэў.

## АКНО НА ПЯТЫМ ПАВЕРСЕ

Заснуў дом насупраць даўно.
Чаму ж сярод ночы глыбокай
На пятым паверсе акно
Гарыць, як нядрэмнае вока?

І мушу цяпер я гадаць:
Няўжо засядзеліся госці,
А мо прыблукала бяда,
Хвароба зваліла кагосьці?

А можа, сям'я прыбыла
І маці, як рупная пчолка,
Калыша сваё немаўля,
Мяняе змакрэлую полку?

На вуліцы дождж шаргаціць,
На вуліцы ціха, ні кроку.
Душа, нібы зорка, трымціць,
Яшчэ да світання далёка.

Гляджу — і знікае спакой,
І слова прайшло, адбалела...
Ляжыць пад цяжкою рукой
Паперы сумёт снежна-белы.

www.kamunikat.org

## ПРА ПАЭЗІЮ

Зноў фразы да слыху майго далятаюць,
Яны ўжо старыя, гучалі не раз:
«Паэзію меней і меней чытаюць.
Ёй месца няма, не такі сёння час».
Услед галавой паківае з дакорам,
Усмак пазяхне і дадасць дабрадзей:
«Паэт не абуе, паэт не накорміць...
Якая ад вершаў карысць для людзей?»
Паэзія...
Слова тваё трапяткое,
Дзе водгулле шчырага болю звініць,
Спрабуюць спісаць разам з цвілай мукою
Ці з футрам нягеглым на пару ўцаніць.
Паэзія — маці святых парыванняў,
Любові і веры над светам крыло...
З тупой ненажэрнасцю вечна змаганне
Пад сцягам тваім чалавецтва вяло.
Галодны і босы, ды з песняй на вуснах,
Люд працы за праўду ішоў на вайну.
І што тут даказваць, гісторыя вучыць,
Сам Ленін паэзіі ведаў цану.
Не вершы,
а доля —
і ў змесце, і ў форме.
Пішу і спагады сабе не прашу...
Паэт не абуе, паэт не накорміць,
Ды песня сагрэе і ўзвысіць душу.

## НАД ПОЛЕМ ВЕЧНАГА ЧАРНАВІКА

Даўно стамілася рука,
А думкі просяцца на волю.
Над полем вечнага чарнавіка
Узносіцца світанне бою.

Пакуль душу не збіў разлад,
Пакуль ёсць кропля нейкай сілы,
Хутчэй туды — за далягляд,
За аблачынкай легкакрылай.

Свабодны ад пустых надзей,
Ад беспрытульнага чакання,
Адчуў, што толькі гэты дзень
Усё мне высвеціць дазвання.

Ён шлях падказвае пяру,
Бязлітасна паперу крэсліць...
Я сто разоў яшчэ згару,
Ды на сто першым уваскрэсну,

Каб славіць і прымус,
і волю
Світання радаснага болю,
Пакуль не спыніцца рука
Над полем вечнага чарнавіка.

* * *

Я не вымольваў слоў пяшчотных...
Як дождж
да смяглае раллі,
Яны прыходзяць незваротна
На грэшнай і святой зямлі.

Іх нараджэння таямніца
Не падуладна адкрыццю.
Бруіць тваёй душы крыніца
Насустрач спешнаму жыццю.

І дзівіць дар яе мілосці
На свет выносіць дзень пры дні
Святло глыбіннай прыгажосці,
Пясчынкі ціхай дабрыні.

Жыццё свой круг
імкліва вершыць,
Ды застаецца вечны шлях,
І шэпт, і пацалунак першы
На разгарачаных губах.

Твой спеўны голас не сціхае,
З'яднаў ён неба і зямлю.
Жыву,
пакутую,
кахаю
І праз цябе ўвесь свет люблю.

## КРЫК НАРАДЖЭННЯ

Ружовы малы камячок
Заходзіцца плачам і крыкам.
Успыхнуў жыцця светлячок
На нашай планеце вялікай.

Крычы,
чалавечак,
крычы,
Шырэй адкрывай свае вочы,
Каб згінулі ў цемры сычы,
Што свету пагібель прарочаць.

З надзеяй глядзяць на цябе
Зямныя,
касмічныя вёрсты.
Ты выстаіш у барацьбе,
Хоць век твой суровы і жорсткі.

Ты многа павінен адкрыць,
Пракласці да шчасця дарогі...

Над светам лунае твой крык,
Як вечны сігнал засцярогі.

www.kamunikat.org

* * *

Хвароба,
смутак,
радасны настрой —
Усё ў жыццё звычайнае сплялося...
Так і ў прыродзе:
Яснаю парой
Азмрочыць дзень
дажджом раптоўным
восень.
Ты — чалавек.
Калі бяда паўзе,
Прад ёй ніколі не спяшай здавацца.
Адлюстраваны у тваёй слязе,
Павінен свет не плакаць,
а смяяцца.

**СУТНАСЦЬ**

*Аляксею Дудараву*

Прыходзім для чаго мы ў гэты свет,
Што тут пакінуць назаўжды павінны?
Пражыта многа,
ды які твой след?
А час бяжыць,
спяшаюцца хвіліны...
Пытаннямі такімі я даўно
І невылечна,
як відаць,
хварэю,
Хоць сонца шчодра свеціць у акно
І дзеці весела ў двары дурэюць.
Там,
паміж іхніх,
чую галасы
Маіх дачок — гарэз светлагаловых.
Далёка ім яшчэ да паласы,
Калі трывожна
сэрца спеліць словы.
Калі на вочы набяжыць сляза
Няпрошана,
здаецца, без прычыны,
І дум шчымлівых не пераказаць,
І ты глядзіш,
глядзіш у твар Айчыны.
Глядзіш у вочы пасівелых хат,
Дзе мудрасць продкаў

у хатуль сабрапа,
Дзе па-старому,
як вякі назад,
Хлеб наразаюць стоячы,
з пашанай.
Глядзіш у нетры
дымных гарадоў,
Дзе ўзведзена на п'едэстал работа,
Дзе ў гулкай кузні
вогненных гадоў
Дух і метал
куюцца вечным потам.
Жылі і мы нялёгка на зямлі —
За слова
спаганяе час сурова.
Душой мяцежнай
праўду берaглі
І самае святое — нашу мову.
Чакае ўсіх наступнага прысуд,
Але не збудаваць жыццё інaчай.
А што не так — няхай жа родны кут,
Як бацька,
паўшчувае, ды прабачыць.
Сінічка ценькае,
блакіт дзяўбе,
Смяецца сонца, і гуляюць дзеці...
І нешта застаецца ад цябе
На гэтым
найдарожшым
белым свеце.

# КУЛЬМІНАЦЫЯ

Паэма

www.kamunikat.org

...Вообразите, что будет, если десятки
и сотни тысяч людей воспылают
страстью догадаться не о том, как
удобнее жить, а о том, зачем жить,
*Максім Горкі*

**Зачын**

Дваццаты век на схіл рашуча верне,
Ды белы свет ад жаху не аслеп.
Упарта людзі сеюць, спеляць зерне,
Бо ў ім — і доля, і штодзённы хлеб.

Яшчэ ў палёце маладым, імклівым,
Нібы сама дзівуецца з красы,
Ускідвае зямля палеткаў грыву —
Плывуць між зор і шэпчуць каласы.

З крыніц глыбінных спеўна сіла рвецца,
Яе не цішаць спёка, халады.
І неспазнанай радасцю здаецца,
Як і даўней, глыток жывой вады.

Атрутаю не спісанае ў рэтра,
Да скону заручонае з жыццём,
Сілкуе грудзі шчодрае паветра
Дапытлівасці вечным пачуццём.

І чалавек, прывучаны старацца
Адважна несці долю на плячах,
Захоўвае,
як блаславенне,
працу,
Якая розум выправіла ў шлях.

І колькі б ні цвіло зарой усходаў,
Заходаў ні сыходзіла на скон,
Суровай геніяльнасці прыроды
Душа аддасць без вагання паклон.

Яна гарыць адчайным захапленнем,
Бо ведае малы прамежак свой.
Стагоддзе нават —
крохкае імгненне
На цыферблаце вечнасці нямой.

І я ўбіраю добрыя прыкметы,
Зямлі шаную згублены спакой,
Зліваючыся з неабдымным светам
Крывінкай кожнай,
жылкай трапяткой.

І рэкі,
як працяг набраклых венаў,
І неба,
як разліў маіх вачэй...
Рассоўвае абмежаванні сцэны,
Істота прагне жыць смялей, шпарчэй.

Ды б'юць у твар далёкія зарніцы,
Крыжуюць сэрца

болю бальшакі,
І подых нечуванай навальніцы
Кранаецца даверлівай шчакі.

Жыццю зямному
сёння прама ў грудзі
Нацэлена варожасці кап'ё.
І ты чужым сумленнем не адбудзеш,
Патрэбна мець балючае,
сваё.

І кожны з нас цяпер не мае права
Маўчаць або ружовенька маніць.
Эквівалентам нейкім іншым праўду
У гэтым свеце нельга замяніць.

Імчыцца век
апошняй электрычкай,
Але скрозь гул трывожыць чуйны слых
Няспынная святая пераклічка
Ратаяў,
Вояў — мёртвых і жывых.

Дыхне з палёў славянскіх
вечным Словам,
Заб'ецца сэрца ў рытме галасоў,
Абнятае,
нібы вязьмом жытнёвым,
Вялікай крэўнай повяззю часоў.

Зямля мая...
Паклон усім вытокам,
Што вызвалялі лёс мой з нематы,
Бо ведаю: за кожным людства крокам —
Святло тваёй высокай дабраты.

Яднаннем тым,
Што ад пары паганскай
Цячэ ў крыві,
Я нораў твой люблю.
Што б ні было,
Ты з мудрасцю сялянскай
Прымаеш семя ў спелую раллю.

Я плоць ад плоці
Глебы цёмна-шэрай,
І мне сюды вяртацца праз гады,
Але пакуль жыву — будую веру,
Як засцярогу ад сляпой бяды.

Вучуся ўсё,
што свет няўдала робіць,
Лічыць не нейчай,
а сваёй віной
І промах найглабальнейшы,
І дробязь
Аплочваць самай дарагой цаной.

Каб існаваць у часе і ў прасторы,
Шчыруй,

www.kamunikat.org

планета,
па жыцця сяўбе,
А мне пакінь свае пакуты, гора...
Я выклікаю памяць на сябе.

**Плынь праз сэрца**

Яшчэ і душа не балела,
І цела бязважкім было,
А крэўнасць славянская смела
Уклала мне ў рукі вясло.

Паставіла човен на хвалі:
«З надзеяй і верай плыві!»
Імклівей, байчэй заснавалі
Гарачыя токі ў крыві.

Мінуўшчыны рэчкай,
Дзе вусціш
Усюды, як вокам ні кінь,
Плыву ад вытоку да вусця —
Плытчэе глыбокая плынь.

Паганства варушыць у цемры
Замшэлыя жахі высноў:
Мільгаюць няўлоўныя цені
Купалак,
Звяроў,
Лесуноў.

А ранкам над селішчам кожным
Хістаюцца сонна дымкі.
Страсаюць расу асцярожна,
Пад сонцам трымцяць каласкі.

Над полем Ярыла іграе,
Трапечацца золата струн.
Далоні свае прасціраюць
Дажбог, і Вялес, і Пярун...

Не, продкі ў багоў не прасілі
Для некага злой варажбы.
Сабе толькі кропельку сілы,
Бо трэба дажыць да сяўбы.

Не вабілі войнаў дарогі,
Балела адным галава,
Што стома падкошвае ногі,
А трэба дажыць да жніва.

Жыццё,
Хоць яно і на зломе,
Мазоль не пускаў на спачын.
У жмені зярнят,
У саломе
Рос долі высокай зачын.

І мудрасць вузлом завязала
Святы запавет для дзяцей:
«Памерці збіраешся заўтра?

Збірайся, а жыта пасей!»

...I зноў я плыву,
а навокал —
Магілы, капцы, курганы.
О, колькі адвагі высокай,
Любові хаваюць яны!

І памяці хваля літая
У гулкую сечу шпурне.
Ардынскай гайні капытамі
Раструшчаны грудзі ў мяне.

На спелыя травы маўкліва
Мая галава ўпала з плеч.
З пагардай тэўтонец пыхлівы
Абцёр акрываўлены меч.

Снягі,
што крывёю набраклі,
Расталі,
Бягуць раўчуком.
На край наш
Зноў шчэрыцца рабства
Настылым французскім штыком.

Горб паншчыны цісне на полі
Спіну ад відна да цямна.
Душа палымнее ад болю —
Шалее бізун цівуна.

І роднае слова спрадвеку
Плаціла крывавы аброк.
Сляза гвалтавання і здзеку
Праясніла годнасці зрок.

Народам не быць безгалосым,
Іх Леніна геній з бяды
Выводзіў,
Зліў братнія лёсы
У велічны лёс назаўжды.

Настойліва розум і праца
Стваралі абуджаны свет:
Ад курных хацін да палацаў,
Ад кола
да зорных ракет.

Нястомныя дойліды, цеслі,
Ліцейшчыкі і ганчары
З далёкага часу прынеслі
Пашану да слова:
«Майстры!»

Іх справай цяжкой, апантанай,
Парой на мяжы забыцця,
Для новага зерня ўзарана
Шырокае поле жыцця.

У космасе рупяцца людзі,
Ды продкам паклонімся зноў,

Бо жывіцца сённяшні будзень
Крыніцаю першаасноў.

Мае запалонены вочы
Узлётам мсціслаўскіх званіц,
Сафійкі паставай дзявочай,
Карункам разных аканіц.

І фрэска святлом наплывае
Праз прысмерк стагоддзяў сівых,
І кафля цяплом, як жывая,
Кранецца далоняў тваіх...

Ля цэглы ад вежаў, разбітых
Сляпых пустадомкаў рукой,
Стаю, горкай думай спавіты,
Згубіўшы дарэшты спакой.

Але не прагрэс вінавачу
(З ім спадчына можа дружыць),
А тых джэнтльменаў удачы,
Якім усё роўна дзе жыць,

Якія ярлык забабонаў
На долю спрабуюць ляпіць...
Нам трэба ахоўнаю зонай
Народную памяць зрабіць.

І перад нястомнай прыродай
Мы ў вечным,
нясплатным даўгу.
Патрэбны з ёй еднасць і згода
Трывалыя,
Не на бягу.

Цікуе яна з недаверам,
Не шчодрыцца на спарышы,
То дрэвам,
То птушкай,
То зверам
Шкрабецца і плача ў душы.

Ёй вусцішна,
Цесна
І мулка
У жорсткіх абдымках ярма.
Шукае збавення, прытулку,
Ды дзе там,
Даўно іх няма.

Мы знішчыць павінны завалы
Дзікунства,
Ляноты,
Маны,
Каб кнігі Чырвонай не стала,
А ў чорнай — сканалі яны,

Каб дзень стаў на шчасце ўмалотны,
Надзеяй адорваў дзяцей,
Каб з неба ішоў не кіслотны,

А радасны дождж-грыбасей,

Каб цешыў цяністасцю свежай,
Цягнуўся да сонца ў зеніт
Дрымучы абшар Белавежы,
Палесся жывы аксаміт.

І продкі,
глытаючы сліну,
Не елі з чужога стала.
А чым жа наступнікі вінны,
Каб існасць іх горшай была?

Усё можна толкам паправіць,
І зробім,
Бо мы не ў гасцях,
Бо крута замешана праўда
На нашай крыві і касцях.

Куды б ні выносілі думы,
Айчыны абрыс не згублю.
Тады прачынаецца дужасць,
Як зерне трапляе ў раллю.

А зерне на камень не ўпала,
Бо Пушкіна вольны радок,
Крынічнае слова Купалы
Выводзяць на новы віток.

Мінулае,

Сёння
І заўтра —
У трох вымярэннях жывем.
Я веру:
Народзіцца аўтар
Не знаных дагэтуль паэм.

І прыйдзе яшчэ летапісец,
Каб час вечным словам звязаць,
Каб толькі сапраўднае ўзвысіць,
Адзіную праўду сказаць.

І памяць паможа натхненню...
Будуючы хату быцця,
Вянцы пакладуць пакаленні
З надзеяй на доўгі працяг.

Каб знішчыць варожасць, пагрозы,
Адпрэчыць агонь ад вянцоў,
Датла спаляць
Светлы свой розум
Мільёны зямных мудрацоў.

І толькі вялікая праца —
Звон кельмы ці шоргат пяра —
Пасобяць планеце ўтрымацца
На цвёрдай арбіце дабра.

Каб памяць не стала кароткай,
Каб білася сэрца часцей,

www.kamunikat.org

Падкажуць суровыя продкі:
«Збірайся, а жыта пасей!

Раднёю і мовай не грэбуй,
Ты — колас паміж каласоў...»
Бруіцца высокае неба
Над чуйным спакоем лясоў.

Міргаюць халодныя зоры,
Гудуць маладыя вятры,
І з вечнасцю хвалі гавораць
Дняпра
І маленькай Віхры.

Я спеўнай зямлі пакланюся,
У вочы яе зазірну,
Над плынню няспыннай нагнуся
І жменяй вады зачарпну.

Напоіць мой корань жывучы
Гаючай надзеі глыток —
Яшчэ невядома, дзе вусце,
Куды працягнуўся выток.

Таму непарыўна, трывала
Я крэўнасцю зліты з усім,
Што нашаю памяццю стала,
Што лёсам магло стаць маім.

Жыццё мне прынесла нямала
Зямных векавечных трывог.
І тое адкрыць не ўтрывала,
Аб чым я і думаць не мог.

Адданасцю,
Верай прыкуты,
Яму і сабе не зманю.
Іду праз любоў і пакуты
Насустрач апошняму дню.

Той ласкі не прагне хвалебнай,
Хто даў напачатку зарок:
Паэт у жыцця не нахлебнік,
Ён сейбіт,
Змагар
І прарок.

Ён моцна нязгасную памяць,
Як свечку,
Трымае ў руках.
Масты за сабою не паліць,
Бо з ім не закончыцца шлях.

У заўтрашні дзень нада мною
Аблокі, як мары, плывуць.
Там дружнай, адзінай сям'ёю
Харошыя людзі жывуць.

Не веру, што будзе іначай.
Калі я навечна спачну,

www.kamunikat.org

То ў сне непраглядным убачу
Жыцця маладую вясну.

Акрыецца квеценню белай
Зямля,
каб жаданаю быць...
А сэрца маё што і ўмела —
Дык толькі балець і любіць.

**Вочы дзяцей**

Надыходзіць такая хвіліна,
Чым далей, то часцей і часцей —
З пачуццём невыказнай правіны
Я гляджу на маленькіх дзяцей.

На пяро, што ўслаўляла натхнёна
Свет жывы, непаўторны,
спаўна,
Цісне грузам няшчадным,
шматтонным
Чалавецтва скразная віна.

Кроў дашчэнту яна ўзбунтавала,
І прыбой болю з часам не сціх...
Як адчай палымнее ў правалах
Вачанят
Тых бяздомных малых,

Што брыдуць між руінаў Лівана
У застыла-смяротнай журбе,
Што жабруюць ля сцен Ватыкана,
Прадаюць у прытонах сябе.

Скуль спагады яны прычакаюць?
Дзе прыдбаюць прытулак які?
Бо дайшло, што дзяцей забіваюць
І злачынцы,
І самі бацькі.

Топяць,
Як шчанюкоў,
Іх у ваннах,
Труцяць газам і душаць пятлёй.
Час пульсуе жывою мембранай —
Хрып і стогны гучаць над зямлёй.

Скаланешся,
Аглушаны раптам,—
Боль звініць у газетным радку:
Хлапчукоў і дзяўчынак у рабства
«Свет свабодны» вядзе за руку.

Бог нажывы не вучан мілосці —
Гоніць пот,
Смокча юную кроў.
Храбусцяць далікатныя косці
Пад абцасам грашовых дзялкоў.

Помню бляск зверавата-галодны

Пад мастом,
Што над Сенай пралёг.
Вочы, вочы...
У вір ваш халодны
Не глядзяць больш
Ні д'ябал,
Ні бог.

Узрываюць спакой тыя вочы...
Людзі,
Мы вінаваты адны,
Што слязіна пакуты сірочай
Прапаліла наскрозь шар зямны.

Крык дзіцячы планету хістае.
Як жа жыць?
Белы свет,
Адкажы...
А яшчэ над усім вырастаюць
Ад зямлі і да неба крыжы.

Бездань дымам крывавым клубіцца
Смерць бярэцца ямчэй за кассё...
І не можа пра гэта забыцца
Нават той,
Хто забыўся на ўсё,

Дзеці — наша ў наступнае пошта,
Нітка сувязі з ім,
Талісман.
Людзі, людзі...
Якім страшным коштам
Нам абернецца прагнасць,
Падман.

Не, не будзе астатняй хвіліны,
Трэба зараз рабіцца чысцей...
Каб у полымі свет не загінуў,
Пазірайце часцей на дзяцей.

### Пісьмо ў Ліён

Я помню Вашу радасную ўсмешку, мадам Лавэль — мой дыспутант натхнёны, і сумную, калі з дачкой-пацешкай Вы пакідалі сцены павільёна. Апошні дзень на выстаўцы быў тлумны, нам давялося наспех развітацца. Паверце, мне таксама стала сумна: прывык адказваць Вам і ў Вас пытацца. Газетна-тэле-радыёвыдаткі, хлусня або інфармацыйны голад сілкуюць недавер, якім спачатку трымцеў і Ваш пявучы, мяккі голас. Смяяўся я ў душы, калі заўзята, як выбракоўшчык-кантралёр завода, Вы доўга аглядалі экспанаты, хмурнелі, нібы восеннюю пагода:

— Няўжо прыёмнікі, магнітафоны, веласіпеды, зручныя надзіва, у Беларусі робяцца штодзённа?

— Але,— даваў стэндыст адказ пачціва. Пытанні паўтараліся бясконца, даходзіла да гэтакіх здагадак:

— Прызнайцеся — купілі ўсё ў японцаў, сваё кляймо набілі — і парадак?

І я тлумачыў з гумарам, цярпліва, што наша ўсё, не купленае недзе, што мы жывём не ў хатках сіратлівых, што толькі ў запаведніках — мядзведзі. Магчыма, і пісаць было б нявартa, і ўспамінаць такое недарэчы, ды як адпрэчыць тое, што не жартам увесь народ маной пра нас калечаць. Адзінкі помняць Францыю-змаганку, братэрства наша ў бітве з чорным збродам. На глебе забыцця растуць паганкі з неафашысцкім пахам найсмуродным. Ды як бы памяць знішчыць ні хацелі, злавесны цень Барб'е — Ліёна ката — зліваецца ў адно з маўклівым ценем нацэленых на нас ракет крылатых.

Мадам Лавэль! Вам праўду ведаць трэба, дабро і зло Вы цвёрда вызначалі. Я помню: вочы, колерам ад неба, цямнелі ўраз пагардай незвычайнай, калі кардон паліцыі «рахманай» прабіўшы сілай дзікай і шалёнай, крушылі экспазіцыю душманы, што зладзілі сабе гняздо ў Ліёне, калі з пульвелізатараў заплечных, падобныя на карнікаў-фашыстаў, станкі, машыны пачалі нявечыць паклёпным, слоўным брудам сіяністы.

Мадам Лавэль! Жыццё — не толькі свята. Нянавісці зацятай мелюць жорны. Пакуль яшчэ ахвотнікаў багата па самым светлым пэцкаць самым чорным. За тыя дні Вам давялося ўбачыць, кім не дабро, а зло і лютасць правяць, чаму яны, як лёд вады гарачай, як совы дня, баяцца нашай праўды. Краіна, што ў народаў на прыкмеце, дзе больш няма разутых і галодных, дзе ў новы дзень ідуць без жаху дзеці,— наш аргумент бясспрэчны і галоўны...

І ўсё ж Ваш твар запомніўся мне добрым, калі ў сваім складным няўтульным крэсле сядзелі Вы з Жанет і доўга-доўга лавілі гукі беларускай песні. Зноў бачу Вашу маладую радасць, што зробіш тут — жанчына ёсць жанчына, калі з ільну сукенкі прымяралі і ў ладкі пляскалі з тае прычыны; калі Жанет узбуджаная смела (у падарунак ляльку атрымала!) мяне крыламі ручанятак белых за шыю абняла, пацалавала. Як долю нашу назавеш гаротнай, калі душу напоўняць дзіўнай сілай няўлоўны дотык пасмачак пяшчотных, цяпло шчакі даверлівай і мілай? І мне ў такое хочацца паверыць: нібы дэльфіны, дзеці ад напасці свет, як тапельца, вынесуць на бераг усеагульнай еднасці і шчасця. Хай нашы дочкі выкінуць з ужытку неразуменне і ў суседскай згодзе жыцця надточаць суравую нітку, працягнутую ў новае стагоддзе.

Мадам Лавэль! Няхай да Вас удача па хвалях Роны кожны дзень вяслуе. Я ведаю — Вы добры ўрач дзіцячы і будучыня Вам руку цалуе. Хай

доля Вас адорвае міласцю і сэрца абмінае злая скруха... Як абяцалі, прыязджайце ў госці. Лепш раз убачыць, чымся доўга слухаць!

**Пералёт: Катанія — Рым**

З Палерма да Катаніі
праз востраў
Нас вёў і сонца, і дажджу эскорт.
Прафесар з Сіракузы — гід узнёслы —
Пашкадаваў: «Ужо аэрапорт!»

Экзотыка і доўгая дарога
Змаглі за дзень
настолькі ўшчэнт змарыць,
Што болей не хацелася нічога:
Ні есці,
Ні курыць,
Ні гаварыць.

Я выйшаў на пляцоўку з залы гулкай
І моўчкі аглядаў нязвыклы свет.
Вулкан каржакаваты пыхкаў люлькай,
Курыў са смакам, нібы ўшацкі дзед.

Як ён на прызбе — барадаты, лысы —
Сядзеў, каб несці мудрасці урок.
І вось яго няпэўныя абрысы
Сцёр з гарызонта нецярплівы змрок.

Пасадка...
Перш паднялі лэдзі ў крэсле.
Па трапе ўгору паплыла адна,
Але і седзячы, паважна несла
Сваю сівую галаву яна.

Разбітая паралюшам турыстка,
З вачмі, нібы прыкрытымі слюдой,
Сачыла потым, як салон іскрыўся
Стракатай разнамоўнай грамадой.

І мы ўзляцелі ў неба непрыкметна.
Уніз зірнуць прапанаваў сусед —
Нядрэмнае жывое жэрла Этны
Чырвоным вокам падміргнула ўслед.

Яно нібыта ведала, што хутка
Надвор'е нам падкіне кепскі жарт...
А покуль белазубы,
станам гнуткі
Разносіў мінеральную сцюард.

Сумуючы над доляй свету важкай
(Бліжэй да бога падняла зямля!),
Чатыры чорна-белыя манашкі
Ружанец церабілі спакваля.

Смуглявых дзетак пры няспынным гуле
Закалыхаў усемагутны сон.
І лашчылі лагодныя матулі

Сваіх нашчадкаў позіркам мадонн.

Бясконца дзелавітыя японцы
Сядзелі так, як і належыць ім,
Прадстаўнікам зямлі,
дзе ўсходзіць сонца,—
Над кожным з іх свяціўся жоўты німб.

Спакуслівыя, нібы шакаладкі,
Абгорнутыя фольгай залатой,
«Плейбой» гарталі спадцішка мулаткі,
Хоць яснелі цнатлівасцто святой.

Цягнулі дабрачынныя галандцы
Маленькімі глыточкамі каньяк.
Іх шчокі адлівалі роўным глянцам,
Яны даўно жыцця адчулі смак.

А наш паэт у вуснах няньчыў слова,
І ўсё ў ім да драбніцы ажыло:
І руская трывалая аснова,
І зухаватасць, і вачэй святло.

Ён крочыў там,
дзе вольных рэк разлівы,
Дзе шыр палёў у спеўнай старане.
Свяціўся твар узнёсла і шчаслівы,
Што ад душы зайздросна стала мне.

Пад манатонны рокат самалёта
І я аддаў утульнасці паклон.
Пракручвала глыбокая дрымота
Калейдаскоп сумбурных хуткіх дзён...

Ступаў, і аглядаўся ў захапленні,
І думаў —
шчасце, што на свеце ёсць
Народ, які душу,
любоў,
натхненне
Уклаў у незямную прыгажосць.

Музеяў непадлічаныя скарбы,
Фантазіі скульптурнай смелы ўзлёт
І рыбных, і фруктовых рынкаў фарбы
Зліваліся ў дзівосны карагод.

А потым паплылі перад вачамі:
Хлапчук-жабрак, заручаны з бядой,
Дзядка старога пышнае вянчанне
З дзяўчынай неймаверна маладой.

І сніліся глухія катакомбы,
Дзе з дуру мы згадзіліся пабыць.
Такое і фантаст з яго апломбам
У страшным сне не здолее ўявіць.

Праз доўгі строй нябожчыкаў шкілетаў,
Прышытых да аснасткі драцяной,
Ішоў.

www.kamunikat.org

Іх пальцы, нібы кастаньеты,
Пашчоўквалі гулліва за спіной.

Мне сніліся стамлёныя баркасы,
І невады, паднятыя з вады,
І рыбака шчарбатая грымаса:
«Даніну мора плоціць не заўжды...»

Грымела рэха — почырк мафіёзі,
Якія суд вяршылі пад судом...
У сне маім,
у зманлівай знямозе
Вялі свой рэй гамора і садом.

І вось плыве асветленая зала,
Дзе я пра маці верш чытаў найперш,
Дзе публіка мне тварамі сказала:
«Без перакладу зразумелы верш».

І раптам выбух,
ды не ў сне, наяве.
Прапаў імгненна мой бязладны сон.
А самалёт нібыта хуткасць збавіў,
Усёй істотай скалануўся ён.

Калі яшчэ раз жахнула маланка,
Сцякла вужом у бездань па крыле,
Затрэсла лайнер злая ліхаманка,
Ен не ляцеў,
а поўз,
як па смале.

Ля «Дугласа» разрады, як снарады,
Кусціліся цяпер з усіх бакоў,
І ён пачаў імкліва
падаць,
падаць,
Каб выслізнуцца з вогненных цiскоў.

Затым святло пагасла ў самалёце,
Які цягнула ўладна да зямлі.
І мне здалося — не на звыклай ноце
Натруджаныя соплы зараўлі.

Як пыхпула агнём, нібы пад крэмнем,
Уся абшыўка левага крыла,
То мільганула думка — недарэмна
Матуля ў сон трывожны мой прыйшла.

І сэрца паўтарала тыя строфы,
Дзе мама,
макі,
росны павучок...
Раздробленае ў аўтакатастрофе
Заныла раптам левае плячо...

Зацеплілася зноў святло ў салоне,
Аэрафея просіць цішыні:
«Наш самалёт у навальнічнай зоне.
Зашпільвайце надзейна рамяні!»

Ды позна...
Уладарыла гайданка.
Ляцелі кофты,
кнігі,
парасон.
Спаўзла ў праход турыстка-англічанка,
Разгублена шукала: «Дзе ж мой трон?»

Спалохана маліліся манашкі
І цалавалі крыжыкі з Хрыстом.
Жагналіся мулаткі,
хоць і страшна,
Але, як з тым часопісам,
цішком.

Заходзіліся дзеці горкім плачам...
«О мам-ма мія!» — нехта застагнаў,
І гэты стогн увесь салон, няйначай,
Аббег і ўжо над душамі лунаў.

А наш паэт, які знайшоў замову,
Які ў свой кут душой ад тлуму збег,
Глядзеў,
і вочы добрыя Кастрова
Надзеяй бласлаўлялі ўвесь каўчэг.

Настойліва сцюард і сцюардэса
Парадак усталёўваць пачалі.
І ўсе, каго яшчэ не збіла стрэсам,
Дапамагалі шчыра, як маглі.

Зямной,
Крыху святой,
А болей грэшнай,
Інтэрнацыянальнай талакой,—
Хто словам,
Хто даверлівай усмешкай,
Хто жэстам,—
Будавалі мы спакой.

І асляпляла неба,
і грымела,
На ўсім абшары лютаваў пярун.
Ды ён крануўся —
стала зразумела —
У розных душах запаветных струн.

Мы вырваліся з небяспечнай зоны,
Унізе вечны горад замігцеў.
І дыхалася лёгка, як з азонам,
І кожны на Зямлю хутчэй хацеў.

На тую, што надзейнасцю сустрэне,
Цяплом прыветным звыклага жытла,
Якая праз стагоддзі не старэе,
Якая ёсць
і будзе,
як была.

У Рыме дождж ішоў...
Трап асцярожна

Людзей наблізіў да жыцця, надзей.
Спускаліся жанчыны ўсё ж трывожна,
Дзяцей тулілі моцна да грудзей.

На тварах засяроджаных дажджынкі
Свяціліся, як кроплі ціхіх слёз,
Нібы мадонны,
Столькі пераажыўшы,
Аплаквалі зямнога роду лёс.

**Танец на П'яцца ды Спанья[1]**

Танцавала дзяўчына ў хламідзе прасторнай,
У нягеглых «бананах», якія змагла
Змайстраваць,
перакроіць з вайсковае формы,
Што са Злучаных Штатаў у Рым забрыла.

Ды не гэта здзіўляла.
На рынках тутэйшых,
Дзе адчайна настойлівы гандаль кіпіць,
Быў бы толькі з грашыма
кашэль найтужэйшы,
І ракету крылатую можна купіць.

Іншай сілай трывожыў,
Прыцягваў малюнак:
Рухі хісткія,
Пасмы — як дыму клубы,
Вочы мёртвыя,
З іх замарожаных лунак
Ліўся холад нясцерпнай сусветнай журбы.

Ад яго прабягалі мурашкі па скуры,
Цыгарэту цягнула
Дрыготка рука...
І была, як Італія ў мініяцюры,
Светлай,
Богам абранай краіны
Дачка...

На яе далікатныя кволыя плечы
Ціснуў шэры бетон тых узлётных палос,
Што ўзнімаюць армады,
Каб нішчыць,
Калечыць,
Каб жыццё заліваць ручаінамі слёз.

Заціскаў рот назойліва і непрыкметна
Кляп нахабны
з газетак
бульварных, пустых.
Адгароджваў ад свету экран,
Беспрасветна
Пачарнелы ад пораху,
Бруду,
Лухты.

[1] П'яцца ды Спанья — плошча ў Рыме.

Абплятала тугое прыгожае цела
Павуцінне масонства,
Злачынных прынук.
Кожнай жылкай яна
утрапёна трымцела —
Кроў смактаў
Чорнай мафіі тлусты павук...

Танцавала дзяўчына да поўнай знямогі,
Рафаэлеўскі твар
То шарэў,
То бялеў.
І здавалася — зараз падкосяцца ногі,
Толькі ёй усё роўна, што будзе далей.

Танцавала, складаючы неамалітву
(Слоў не чуюць,
Дык, можа, убачаць, хоць рух!),—
І на плошчы,
Няўрымслівым сонцам залітай,
Да яе люд бадзяжны хінуўся наўкруг.

Не паломнікі з розных краёў,
Не турысты,
А расхрыстаны табар духоўных калек,
Наркаманаў,
Знявераных,
Целам нячыстых,
Што нічога не бачаць з-пад сонных павек.

Цалаваліся,
Плакалі,
Спалі на плітах.
Шведы,
Немцы,
Іспанцы — жывы Вавілон.
Частка іх за дзяўчынай,
Журбою разбітай,
З фантастычным віхляннем
Брыла наўздагон.

І хацелася мне,
Каб пранізлівым танцам
Юнакоў і дзяўчатак,
Што ў бездань плылі,
Разбіваўся спакой
Дабрачынных галандцаў,
Дзелавітых японцаў —
І ўсіх на зямлі.

...Стома ёй перашкодзіла далей маліцца,
І ляжала дзяўчына,
як птушка,
цішком
На сівых камянях неўмірунай сталіцы,
Ахінаючы свет перабітым крылом.

**Запас трываласці**

Нагружаны трывожнымі ўспамінамі,

Прабіты гонкім сумам навылёт,
У час свайго адлёту ў край калінавы
Згадаў я раптам той у Рым прылёт...

Хоць неба ўсцяж вадою захлынулася,
Палёгку несла золкая імгла.
І мы няспешна праз яе цягнуліся,
Як матылі, да вабнага святла.

Была зямля...
А крышку на адлегласці
Шумлівых галасоў клубіўся рой —
Ішлі пілоты «Дугласа»,
З калегамі
Дзяліліся прыгодаю сваёй.

Не слухаў перакладчык наш, здавалася,
Ды на хаду злавіў абрыўкі фраз.
«У самалёта...
ёсць запас
трываласці...» —
Ён дзелавіта супакоіў нас.

Назаўтра вочы без супынку краталі
Аблічча недасяжнай даўніны.
А Рым бурліў, як магма ў гулкім кратэры,
І смехам,
і журбой
наскрозь зямны.

Ды ноччу, ідучы нядрэмным горадам,
Які даўно,
са школьных год,
люблю,
Падумаў я з непрыхаванай гордасцю
Пра свой народ,
пра родную зямлю.

Які запас трываласці спатрэбіўся
Ім, каб найменне, волю захаваць,
Напоўніцу адчуў плячыма, рэбрамі...
Яны трашчалі так, што не стрываць.

Зямля мая,
усіх часоў пакутніца,
Праз жах і кроў,
праз цемру і агонь
Ты працягнула свету, грэхам скутаму,
Даверлівую,
шчырую далонь.

Цябе сляпой пагардай не сурочылі,
Не адвучылі марыць і спяваць.
Скарынкай чэрствай,
што слязой размочана,
Змагла ты слова веры ўзгадаваць.

Не на паперы, што не знойдзе літасці,
Калі бяда пачне яе крышыць,
Глыбіннай праўды залатыя літары

www.kamunikat.org

Навечна выбіваліся ў душы.

Нас нішчылі, зацята выпрабоўвалі,
Хто — на сцісканне,
нехта — на разрыў.
Але дарма,
ні голадам,
ні бойнямі
Ніхто яшчэ народ мой не скарыў.

Шчымлівым болем да краёў налітыя,
Хоць бедна, ды сумленна мы жылі.
Абпаленыя,
трушчаныя,
бітыя,
Як бурлакі, надзею валаклі.

Чаму ж нам грэбаваць сваёй асноваю:
І спадчынай сівой, і новым днём,
Якія для нашчадкаў адваёваны
Крывёю і нязводным мазалём?

Ні часам, ні адлегласцю не скрадзены,
Айчыны твар нам свеціць у жыцці,
Адорвае неўтаймаванай радасцю
Вярнуцца,
да спрадвечнага прыйсці.

Асветлены заранкай куст калінавы
Разбудзіць на світанні салаўя,
На спеў ты пойдзеш тою каляінаю,
Што павяртае на кругі свая.

І скажаш:
«Як жыццё ні адкрывалася
Размахам вышыні і глыбіні,
Ёсць у мяне адзін запас трываласці —
Зямля дзядоў, дзе нашы карані».

**Карані**
*(Радкі радаслоўнай)*

А карані мае ў крывіцкай глебе...
Рассоўваючы ўладна год за годам
Падзол, пясок, жвірок і камяні,
Яны ідуць углыб і ўшырыню.
У нас зямля заўсёды на ўраджаі
Скупілася, але народ не ганіў,
Не пакідаў карміцельку сваю.
Ішоў мужык у свет, дык толькі з гора,
Калі ні лапіка зямлі не меў.
Люд працаваў, цярпліва гоні песціў —
Дзіця нягеглае звычайна даражэй.
Атожылак спрадвечных хлебаробаў,
Чый пот і кроў зямля трывала помніць,
Я іх таксама помню ўсіх рукамі,
Якія могуць і каня запрэгчы,
І гной накідаць спраўна на калёсы,
І ў лузе ўволю памахаць касой.
І я радок звычайнай радаслоўнай
З мінулага вяду, як баразну,

Бо ведаю, не будзе зразумелы
Без гэтага і наш высокі дзень.
Гісторыі каляная тканіна
Саткана з лёсаў — нетрывалых нітак,
Ды род ссукае іх у столькі столак,
Што цяжка і асілку разарваць.

* * *

Дзяды мае памерлі надта рана...
Віной таму не іхні кволы корань,
Ім жыць і жыць бы, ды была вайна,
Прайшла яна праз іх, і не адна.
Германская паксціла Васіля,
Шэрашынельнік, радавы салдат,
Вярнуўся з фронту дзед з узнагародай —
Крыжы віселі на худых грудзях,
Якія біла хрыпамі задышка.
Сярод балот зацвілых пад Смаргонню
Труцілі немцы газамі ў акопах,
Ды з таго свету выцягнула дзеда
Няўтомная мужыцкая прырода.
Пад саламяныя густыя стрэхі
Прынёс ён слова бальшавіцкай праўды
І ў вёсцы, што даўно чакалі волі,
Стаў неўзабаве старшынёй камбеда,
А потым запісаўся ў камунары.
Дзед да сялянскай працы асаблівы
Меў смак, рабіў заўжды яе прыгожа,
Калі сказаць так можна — па-мастацку.
Яго вялікія цяжкія рукі
Не толькі плуг, касу трымалі ёмка,
Але сякеру, долата, габэлак
І іншыя майстроўскія прылады.
У кроснах дзеда, сонечных і зграбных,
Снаваў чаўнок увішна, паслухмяна,
І сцены хат азорвалі вясёлкі,
Красой зямлі зіхцелі дываны.
Скакаў, нібы жывы, дубовы пранік,
Старанна адбіваючы бялізну,
І лёгка лёталі па ёй качалкі,
Бо марку дзед умеў трымаць высока.
Нажом выстругваў ён такія лыжкі,
Што царскаю здавалася радзіне
Нішчымная вясковая спажыва.
Быў у яго яшчэ адзін занятак,
А на сучасны лад гавораць — хобі.
Выконваў ролю вечнага дарадцы —
З малою і вялікаю бядою
Прыходзілі ў ягоны двор ганцы.
Прапала раптам з выгану цялушка —
І дзед прадказваў, дзе яе шукаць.
Каня-кармільца вывелі са стайні —
Ён дзень-другі маўкліва разважаў
І злодзея вылічваў без памылкі.
Дзяўчыне мог параіць, што рабіць ёй,
Каб хлопца да сябе прываражыць.
Вылечваў дзетак ад упуду і находу,
Ад залатухі, вогніка і ўроцы,
Мог і дарослым рады траўкай даць.

У наваколлі склалася легенда:
І лечыць, і варожыць ён удала
Па «чорнай кнізе», што займеў ад продкаў,
І дзеда нараклі чараўнікам.
Але адгадка тут занадта простая —
Ён быў даволі ладным грамацеем,
Меў дар прыродны назіраць і думаць,
Найменне ведаў кожнай зёлцы ў лузе
І чым яна карысна чалавеку.
Ва ўсё жывое да слязы ўлюбёны,
З бабуляю Праскоўяй вёў сямейку
Дай бог. Калі цяпер, па пашых мерках,
На тры хапіла б, нават з нейкім гакам.
Паспеў дзед і мяне крыху пагушкаць
У змайстраванай ім самім калысцы.
І — маці кажа — рагатаў шчасліва,
Калі я грабаў лысіну рукой.

* * *

А з матчынага боку дзед мой — Хведар,
Каб для сям'і здабыць кавалак хлеба,
Падаўся з вёскі на заробкі ў Піцер,
Стаў на Пуцілаўскім заводзе кавалём.
З жалезам разам справай гартаваўся
У пралетарскай маладой сям'і.
Ён слухаў двойны Леніна, і часам
Маё заб'ецца неспакойна сэрца,
Бо па крыві перадаюцца токі —
Гучыць наяве голас Ільіча.
Праз полымя вялікай рэвалюцыі,
Праз два франты крывавай грамадзянскай
Дзед крочыў да свабоднага жыцця.
Ён маладым памёр, не меўшы ўнукаў,
Бо не давалі жыць, смылелі раны,
Цягнуў свінец у целе да зямлі.
Ні ён мяне, ні я яго не бачыў,
Не засталося нават фотакарткі,
Усё ў вайну апошнюю згарэла.
Але заўжды ў самотную хвіліну
Ёсць у мяне падтрымка і апора —
Плячо літое дзеда-каваля.

* * *

Бабуля Вольга так і засталася
Да дзён сваіх апошніх удавой.
На могілках завеяных у Крычаве
Я цалаваў прасветлена і ўдзячна
Яе сухія жылістыя рукі,
Якімі столькі год кароў даіла,
Паставіла на ногі трох дачушак,
Дапамагла і ўнукаў зберагчы.
Бабуля адышла у дзевяноста,
Але такую захавала памяць,
Што, як крыніца, праз гады бруіцца,
Паўнюткая святой жывой вады.
Яна яшчэ і паншчыну заспела,
Сярпом вузенькім, з'едзеным работай,
Абмытым шчодра і слязой, і потам,

www.kamunikat.org

Адбіла шмат паклонаў нізкіх полю.
Але былі ў бабулі дні ўрачыстыя,
Якія згадваліся неаднойчы,
Калі яна як лепшая даярка
Прымала ўдзел у выстаўцы ў Маскве.
Усесаюзны стараста Калінін
І з ёй вёў у Крамлі тады гаворку
І ўласнаручна грамату ўручыў.
Бабуля месца ёй знайшла ў святліцы
На самым відавоку, між акон.
Не стала гэта грамата ахоўнай,
Палілі вёску гітлераўцы двойчы,
Згарэла ўзнагарода разам з хатай.
Дзень жнівеньскі сорак другога года
Для хоцінцаў, што выжылі, застаўся
У памяці цярплівай чорным днём.
За мост, які спалілі партызаны,
За хлеб, які вазілі людзі ў лес,
Смерць баль спраўляла доўга і зацята.
Палілі немцы вёску з двух канцоў,
Другой была бабулі хата з краю.
А перад тым зайшлі ў святліцу трое
І пазіралі, як жанчына ткала
Абрус у кветкі на старэнькіх кроснах.
Раптоўна, як адзін, загергеталі,
Навыперадкі кінуліся трэсці
Вялікі куфар, што ў куце стаяў.
І ручнікі, і посцілкі за рэмні
Запіхвалі спяшаючыся, прагна,
Як быццам мог хто-небудзь адабраць.

І толькі афіцэр стаяў маўкліва,
Паблісквалі на носе акуляры.
Але і ён чамусьці ўстрапянуўся,
Стаў з кабуры вылушчваць пісталет.
А потым ім у твар бабулі тыцкаў
І на сцяну, на грамату паказваў,
Дзе сілуэты Леніна і Сталіна
Выразна праступалі на паперы.
Ён чырванню, нібыта клоп, наліўся,
На грамату свой пісталет наставіў
І ціскаў, ціскаў з лютасцю курок.
Аглушаная стрэламі бабуля
Рванулася да ўнукавай калыскі,
Прыціснула Міхаську да грудзей.
Калі пасля каманды ўнёс каністру
Цыбаты карнік і пачаў пялёхаць
На сцены, на падлогу едкай газай,
Бабуля ўсё нарэшце зразумела —
Зайшлося сэрца, стала як лядзень.
Дрыжачымі рукамі накідала
Адзежын колькі, скрутак палатна,
Паўбохана ў пляцёную калыску
І вынесла далей, за агарод.
Але жытла маленечкі драбочак
Ад фашыстоўскіх вылюдкаў-педантаў
Бабулі не ўдалося зберагчы.
Падбег цыбаты той жа да калыскі,
Лінуў з каністры і запалку кінуў…
Калыску скуб агонь, гарэла хата,
Над вёскаю адчайна галашэнне

Кружылася, і ўгору адплывала,
І там ірвала неба на шматкі.
Стаяла з дзіцем на худых руках
Бабуля вогненнай святой, мадоннай,
Якой яшчэ не бачыў белы свет.
Яна ўрастала босымі нагамі,
Як дрэва ў дол, у гэты родны прысак,
І са сваёй зямлі жанчыну зрушыць
Ні полымя, ні кулі не маглі.

* * *

Мой бацька ў новенькіх лапцях ліповых,
Якія дзед Васіль сплёў адмыслова,
Шлях церабіў упарта да навукі.
А прыклад быў — старэйшы брат Сяргей,
Які не толькі набіраўся ведаў,
Але і ўліўся ў грамаду паэтаў,
Крылатых, бурапенных, як той час.
Слядамі брата смела бацька крочыў,
Бо меў да слоўных таямніц імкненне,
Заўсёды рыфмы ў галаве луналі.
Перад вайной, хоць і зрэдчасу, вершы
Ягоныя траплялі ў друк сталічны.
А ў сорак першым ён, якраз у чэрвені,
Наконт выдання ў Мінску кніжкі першай
Ліст афіцыйны радасна трымаў...
Пасля вайны было ўжо не да вершаў.
Былы зенітчык рукавы закасваў
Сваёй старой трывалай гімнасцёркі —
Пачаў вучыць дзяцей і будаваць.
На лебядой зарослых папялішчах
Драўляных школак ён зляпіў нямала,
Канешне, не адзін, а з грамадою,
Усё ўзнімалі разам — талакой.
Але дырэктар школы (а мой бацька
Быў на пасадзе гэтай надта доўга)
Тады ў адной асобе сумяшчаў:
Заказчыка і тут жа выканаўцу,
А гэта значыць — дойліда, прараба,
Але найболей цеслю, сталяра.
Так, тыя школкі сталі ўжо архаікай,
Не роўня гмахам велічным цагляным,
Якія сёння высяцца і ў вёсках.
(У гэткай школе бацьку перад пенсіяй
Пашчасціла крыху папрацаваць.)
Але тады ў разрусе беспраглядная,
Калі пра цэглу не было гамонкі,
Калі за шчасце быў іржавы цвік,
Блішчэлі жоўтым мармурам бярвенні,
Стаяла школа новая палацам,
Куды і дзверы страшна адчыняць...
І мы аддаць паклон павінны лесу,
Які ў вайну хаваў і прыкрываў,
Які — святы цярплівец — нас выводзіў
З халодных затхлых сховаў і зямлянак
У белы свет, у мірнае жыццё.
І сёння я іду пад шаты лесу,
У храм маленства, пад галін скляпенні,
Дзе слоў не трэба, толькі думаць, думаць,

Душою станавіцца прыгажэй...
Старыя школкі... Час пасляваенны...
Газет шматкі там замянялі сшыткі,
Было там цесна, цёмна і галодна,
І часта замярзала ў іх чарніла,
І пальцы ручку не маглі трымаць.
Старыя школкі... Іх зусім нямнога
Свой век яшчэ цярпліва дажывае.
І гэта добра. Хай у светлых класах
Святлом навукі багацеюць дзеці.
І ўсё ж адну, адну такую школку,
Я думаю, было б зусім не лішне
Пакінуць для нашчадкаў, як музей.
Няхай глядзяць, дзе набірала моцы,
Духоўнага і творчага парыву
Абпаленае пеклам пакаленне,
Каб штурмаваць цалінныя прасторы
І космасу глыбокі акіян...
А бацька пра музей тады не думаў,
Ён размячаў калкамі папялішчы
І зноў збіраў каменні на падмурак.
І мы за ім вось так па двух раёнах
Ад школы і да школы вандравалі,
Як цыганы, вясёлаю сям'ёю,
Пакуль яна не вырасла ў сем душ.
Сярод лясоў, узгоркаў і азёр,
У Глыбачцы — глыбіннай, як і назва,—
Мой бацька назаўсёды кінуў якар,
І мы нарэшце мелі ўласны кут.

* * *

І маміна жыццё — суцэльны ўрок.
Адзін быў толькі доўгі перапынак —
У час вайны ёй дасталася доля
Быць сувязной, а потым — партызанкай.
Кругі агульнай і сваёй бяды,
Кругі блакад, з якімі ў параўнанні
І пекла нават можа здацца раем,
Яна прайшла, каб нараджаць і жыць,
Бо ў светлую хвіліну вызвалення
Ішоў ёй толькі дваццаць першы год.
Настаўніца вярнулася да дзетак,
Да самых меншых: першыя — чацвёртыя.
Як і тады ў вайну, па мірным часе
Яна была надзейнай сувязной
Паміж маленствам і жыццём вялікім.
Аб гэтым пішуць ёй былыя вучні,
А іх не зможа мама падлічыць.

* * *

Ёсць на зямлі спрадвечнае павер'е.
Што чалавеку за жыццё належыць
Дзве справы здзейсніць — і абавязкова:
Падняць, як свой працяг, на ногі сына
І дрэўца пасадзіць і ўзгадаваць...
Сыны і дочкі, а таксама ўнукі,
Дзялянкі маладога сасняку,
У поўнай сіле яблыневы сад,

Дубы і клёны, ліпы і каштаны,
Што падняліся вышай нашай хаты,
Схіляюць прад бацькамі галаву...

* * *

Вайна прайшла, як верхавое полымя,
Над Белай Руссю і над нашым родам,
Але не знішчыла, як ні хацела,
Глыбокіх і жывучых каранёў.
На каранях атожылкі ўзняліся,
Каб трапятала пад лагодным ветрам
Нязводнае зялёнае лісцё.
Шуміць наш род сваёй разгалай кронай,
У ім ёсць людзі рознага занятку:
Будаўнікі, настаўнікі, вайскоўцы...
Але для ўсіх нязменны запавет —
Не толькі род цябе ў жыцці ўзвышае,
Найперш ты сам узвысіць род павінен.
Для гэтага зусім не сімвалічна,
А, як жыццё засведчыла, рэальна
Дзяды мае — пуцілаўскі каваль
І камунар дубровенскі — навечна
Над светам узнімалі серп і молат.

**Па дарозе дадому**

Гул за спіною нарастаў не раптам,
Мяне на павароце абмінуў,
Бадзёра чхнуў салляркай сіні трактар
І на адхоне рэзка тармазнуў.

Махае аднакласнік Віця ўвішна,
І, як заўсёды, з падыходам ён:
— Калі штаны запэцкаць не баішся,
Сядай на мой зашмальцаваны трон.

І чамадан прыстроім,
знойдзем месца.
Ну, што?
Лягчэй у роднай старане?
Паслухай,
адпускнік,
як спаць прыесца,
Напарнікам прасіся да мяне.

Гляджу, пабляк ты за сталом пісьмовым,
Даўно патрэбен мускулам цяжар.
І тэмы знойдзеш.
Вось жыцця аснова —
Наліты хлебнай сілаю абшар.

Давай да нас.
Адчуеш моц у целе,
Адмыеш потам слоўныя грахі.
Успомні, як на практыцы пацелі —
Аж гнуліся, смылелі лемяхі.

Як мы з табою Першамайскім святам
Без сну і ежы ставілі рэкорд.

«ДТ» старэнькі — капрызун закляты,
Хоць і ламаўся, ды араў, як чорт.

Вазьму цябе з рукамі і нагамі,
Ты толькі адмаўляцца не спяшай.
Ідзе, грыміць сапраўднае змаганне,
Як пішуць у «раёнцы»,
за ўраджай.
І днюем,
і начуем сёння ў полі,
Бо ніву дождж пабіў — размах не той.
Зірнеш —
душа аж курчыцца ад болю,
Ды што табе расказваць — хлопец свой.

Камбайн пакуль стаіць. Вязу зялёнку.
І ферму трэба кормам абслужыць.
Вось так, браток, у вёсцы паўсядзёнка
Ад ранку да цямна бяжыць, бяжыць.

Што заглядзеўся? А, палац убачыў.
Няўжо, як прыязджаў ты, не было?
Што і казаць,
жыццё пайшло іначай —
Папрыгажэла, падрасло сяло.

Наконт культуры зараз кожны мудры,
І вёска да халтуры
ні на крок.
Мяне ўжо звераватыя лахудры,
Як печкура, не возьмуць на кручок.

Нам не патрэбен зубаскал залётны,
Што сыпле анекдоты з барадой.
Давай балет,
мастацкія палотны,
Раманы, не налітыя вадой.

Не можаце —
наладзім самі свята,
Не будзем склаўшы рукі мы сядзець.
Спяюць, паскачуць хлопцы і дзяўчаты,
Ды так,
што люба-дарага глядзець.

Не думай, што ўтапіліся ў кілішку,
Што змізарнелі ад прыватных спраў,
Што, акрамя сваёй ашчаднай кніжкі,
Ніхто у рукі іншых кніг не браў.

Чытаем,
хоць з прысылкай кепска стала,
Бо бібкалектар абыходзіць нас...
І я старонак пагартаў нямала,
Ды на пытанні рэдка ёсць адказ.

Усё там складна,
правільна
і гладка,
Як быццам трапіў у квяцісты рай.

А тут жыццё праблем і непаладкаў
Падкіне столькі, хоць ты адбаўляй.

Рамонт абы-які работу душыць,
Дзень-два папрацаваў — і на прыкол.
Даўно начальству прагудзелі вушы,
Ды не знайсці адказных за пракол.

Ужо сезон каторы не да смеху —
Нягегла кормяць «хімікі» раллю.
Даказваеш, а ім — што ўбіў, то ўехаў,
Бо клопат пра рубель, а не зямлю.

Чакалі калектыўнага падраду.
Уведзены, а сэрца ўсё ж баліць,
Бо гінуць, рассыпаюцца брыгады:
Адзін шчыруе, рвецца,
                    два — ляжыць.

Здавалася б, разлік занадта просты —
Як працаваў, ты так і заплаці.
Ды не дае ўраўнілаўкі кароста,
Жывучая яна, як ні круці!

Але цяпер парадку стала болей,
Дырэктар наш у справу добра ўнік.
А помніш (мы былі тады у школе),
Які ў саўгасе правіў кіраўнік.

За правіла займеў такую моду —
Рабіць ваяжы кожны выхадны.
Багажнік напакуе мясам, мёдам —
І шусь да жонкі ў горад абласны.

Не працаваў, сядзеў на чамаданах,
Але да славы меў вялікі смак.
Ды цётцы Ганне — птушніцы стараннай,
А не яму
                    тады ўручылі знак.

Ён злосць зрываў і мардаваў жанчыну,
Ды так, што цётка не магла стрываць —
Паклала ордэн Леніна ў хусціну
І да яго панесла аддаваць.

Ён катэр мараходны для прагулак
Па блату ў порце талінскім дастаў.
І жонку з цешчай —
                    гарадскіх качулак —
Па возеры з канца ў канец катаў.

На добры розум —
                    выгнаць у каршэнь іх,
Ды не, нахабнік маху не даваў.
Як і вялося,
                    збег на павышэнне
У вобласць, хоць растрата і развал.

А ўсе маўчаць і вочы закрываюць
І лічаць —

праўда зпойдзецца сама.
Мы пачакаем — наша хата з краю...
А краю нейкага ў жыцці няма.

Збівалі з тропу вёску перагібы,
Адвечны парушалі працы лад.
І хакаў селянін, нібыта рыба,
Якой у рэчку хочацца назад.

Дачаснік усталёўваў дысцыпліну,
Ды той імпэт не варты і граша.
На дзве зусім няроўных палавіны
Была ў яго падзелена душа.

Мізэрнай часткі хопіць
для грамадства,
А большай пашчырую, бо сабе.
І хочацца на седале ўтрымацца,
І без супыпку пад сябе грабе.

Ягонаму ніхто не верыў слову,
Бо не накорміш байкай салаўя.
Калі пасля прачулае прамовы —
І я — не я і справа не мая.

Затым яшчэ грашовая хвароба,
І не змаглі слабейшыя ўтрываць.
Пра гонар і сумленне хлебароба
Стаў селянін паціху забываць.

Ён мог пад снег пакінуць лапік бульбы,
Няўбраны лён на полі запаліць.
Стаў цешыць вуха многіх ціхі булькат,
Але сумленне чаркай — не заліць.

Рубель вялікі тоіць злую сілу,
Як да яго не маеш галавы.
Прывезці дровы бабка папрасіла —
Паўпенсіі здзіралі з удавы.

Яе слязу і боль
прап'юць за вечар,
І толькі галава гудзе, як звон...
Мы зараз зажылі па-чалавечы,
Дзяржаве дзякуй, што ўвяла закон.

У многіх душы сытасць размарыла...
А я запомніў смак нішчымных дзён.
Які матулі па чарзе варылі
У велізарным чыгуне булён!

Нас з вёскі ўсёй, нібыта галчанятак,
Дымок духмяны ў цесны гурт збіраў.
І кожны лыжкай шчыраваў заўзята,
Аж нос спацелы ўпрысядкі скакаў.

Ля возера вясёлае цяпельца
Яшчэ дасюль мне саграе душу.
З тае пары карміцельцы-зямельцы,
Галоднаму маленству не хлушу.

Дзяцей не ганю мілых і разумных,
Але хапае і ад іх пакут —
Кусанік хлеба выкінуць бяздумна
У смецце
Ці шпурнуць цукерку ў кут.

Жыццё не толькі меншых раздурыла.
Гайня дарослых трутняў без бяды
На карку ў бацькі, мацярок пахілых
Сядзіць аж да сівое барады.

Прайсці праз сытасць, а душой застацца
Без чорных плям,
з сумленнем не лаўчыць
Вось гэтаму вялікаму мастацтву
Сям'ёй народнай трэба ўсіх вучыць.

З нас кожны зараз знойдзе адгаворкі,
Чаму маўчым, не лезем на ражон,
Чаму душа ў палоне думы горкай,
А мы прыстасаванцам б'ём паклон.

Мой голас — хлеб,
наліты спелы колас,
А вось чамусьці з нейкае пары
Прыціхнуў ваш усхваляваны голас.
Дзе боль і гнеў ваш дзеўся,
песняры?

Народ вас надзяліў павагай, славай
Не для таго, каб трэнькаць,
лёгка жыць.
Ён ад імя свайго дае вам права
Змагацца з крыўдай,
праўду гаварыць.

Калі ж не так, то званні, лаўрэацтвы,
Фальшывыя, даваліся дарма.
І нас за гэта можна вінаваціць,
Ды вам жа скідкі
перш за ўсё няма.

Калі б пустапарожнія дэбаты
І мы па кожнай дробязі вялі,
То крошкі хлеба не было б у хатах,
Пазарасталі б хмызняком палі.

Не трэба ўсё валіць на пакаленне,
Якому сіл бракуе ў барацьбе.
Ёсць выйсце, ад застою вызваленне —
Бярэ адказнасць кожны на сябе.

Мы голас часу слухаем і будзем
Шлях ісціне спрадвечнай пракладаць —
У гэты белы свет прыходзяць людзі,
Каб чэсна жыць і шчыра працаваць.

Тваё гняздо...
Бывай! А я паеду.
Цяляты, чуеш, задаюць драза.

www.kamunikat.org

І правільна, даўно пара ім снедаць,
Галодныя, іх, як дзяцей, шкада.

А дзень, відаць што,
будзе чысты, звонкі...
Прыходзь.
Жнём ля Сапронава капца.
Там на камбайне давядзём гамонку
Мы справай да лагічнага канца...

Мне Віктар падміргнуў, далей паехаў.
Душу ён моцна развярэдзіць змог.
Услед глядзеў, пакуль не сціхла рэха,
І не спяшаў пераступіць парог.

**Роздум у бацькоўскай хаце**

У сценах хаты пастарэлай
Жыве душа былых часоў.
Уладна памяць перастрэла
Мяне трывогай галасоў.

Цяпер на скрыжаванні новым,
На свежаку крутых падзей
Мінулае дае аснову,
Каб верай падтрымаць людзей.

Іду ў жыццё, нібы ў разведку.
А хто мяне накіраваў?
Васіль — дубровенскі камбедчык,
І Хведар — піцерскі каваль.

Не, недарэмна выкрасалі
Дзяды напрамак барацьбы,
Не крэйдай, а крывёй пісалі:
«Рабы — не мы, мы — не рабы!»

Слоў агнявых нястрымны вецер
Вакол Зямлі за кругам круг
Ляціць, ляціць па белым свеце,
Каб раздзімаць свабоды дух.

«Мы — не рабы!» —
пры гэтых словах
Заўсёды высвеціць пагляд
І наша поле Кулікова,
І векапомны Сталінград.

О, колькі мы ахвяравалі
На бітву з азвярэлым злом,
Род чалавечы ратавалі
Не словамі — сваім жыццём.

І сёння ўсёй планеты смагу
Папраўдзе
Зможам наталіць,
Бо ёсць славянская адвага,
Якой за ўсё і ўсіх баліць,

Бо ёсць народ, які заўсёды

На грэбні нечуваных бед
Нястомна бараніў свабоду,
Браў пад крыло змарнелы свет.

Быць сынам нашага народа
Не азначае — проста быць.
Належаць да такога роду
Патрэбна лёсам заслужыць.

Што ты зрабіў, каб гэта званне
Здабыць у полі, ля станка?
Адно ў цябе ёсць апраўданне —
Твой розум і твая рука.

А чалавечы век нядоўгі,
Мільгне няўлоўным прамянём...
І мусім разглядзецца добра —
Як мы расцём і чым жывём?

Расцём, жывём...
Вышынь багата
Адольваем за годам год.
Але пакуль з прасторнай хаты
Увесь не вымецены зброд.

А твань зацягвала памалу,
За горла брала спакваля.
Паволі рабства наступала —
Застою,
Прагнасці,
Рубля.

І білі хцівасці паклоны,
Да брудна ейнае рукі
Паўзлі валютныя бароны
І мястачковыя панкі.

Смяротнай ракавай заразай
Яна дасюль свой рэй вядзе,
Пускае бурна метастазы
У душах зломленых людзей.

Яшчэ па схованках штукарацъ,
Пакуль не трапяць на святло,
Фарцоўшчык з блудна-хцівым тварам
І спекулянцкае мурло.

Яшчэ, пасадаю прыкрыты,
Хабарнік з невадам брыдзе
І ловіць залатую рыбку
У скаламучанай вадзе.

Грай невыводных бюракратаў
Гняздо спакою дбайна ўе.
Іх вушы так заткнуты ватай —
Гармата нават не праб'е.

За чын трасуцца рэтраграды,
Хоць выпалі з парадку дня.
Няўмекі,

дурні,
верхагляды
Нахабна лезуць на каня.

Сталіцы поўніць гул і грукат,
Зноў апанентам не да сну —
Астапы бэндэры ў навуку
Імчаць на «Антылопах-Гну».

Пыхлівы клерк, да крэсла ласы,
Карыта збіў з дзяржаўных спраў.
Яму да скону пуп уласны
Усёй планеты цэнтрам стаў.

Туды ж з нагамі клерчаняты:
«З сабою і мяне вазьмі!»
І хлебчуць,
рохкаюць заўзята,
Хоць ім пачухай за вушмі.

І ў дзетак у галовах каша,
Бо вучацца з такіх азоў:
Лайно з кляймом
«Мэйд ін не наша» —
Двайнік сучасны абразоў.

Яшчэ не выведіся хамы,
Народны хлеб
гультай дзяўбе,
І ў дзеянні пакуль праграма
Дзялкоў:
«Ты — мне, а я — табе».

Захлёбваюцца клейкай слінай,
Набраўшы поўны рот маны,
Смакуюць з-за мяжы «навіны»
Угодлівыя шаптуны.

У іх галовах надта ройна.
А перш
чым верыць «галасам»,
Патрэбна паглядзець спакойна:
Хто ж акапаўся
сёння там?

Хто там картавіць і гундосіць,
Лье бруд
на наш святы народ,
А потым за паклёпы просіць
З працягнутай рукой выгод?..

Яшчэ на вышыні маўчальнік:
«Не лезь — і будзе спакайней.
Хай думае за нас начальнік,
Разумны ён, яму відней».

У дробнай сытай калатнечы
Марнуюць тысячы свой век...
Чаму ж прад злом прыгорбіў плечы
Ты -

www.kamunikat.org

шчыры, чэсны чалавек?

Змагайся, не губляй надзеі
І праўду-матку ў вочы рэж.
Ты,
а не злыдні, прахіндзеі
Павінен жыць смялей і лепш.

Ды лепш —
не так, каб пір гарою,
Каб толькі помніць і маўчаць...
Успомні паліто старое,
Паёк нішчымны Ільіча.

Успомні ленінскія словы
Не для цытат,
а як наказ.
Ён быў да пошасці суровы,
Чаго бракуе нам якраз.

Не паратунак — абарона,
«У паступ!» —
чуцен тых загад,
Хто да апошняга патрона
Страляў з чырвоных барыкад.

Тых, што зямлю сваю навечна
У сорак першым абнялі,
Свет і цябе, тады малечу,
Каб быў працяг, абераглі.

Мы — не рабы!
Слоў гордых зорку
Кастрычнік запаліў для нас.
З ім пераклічку і гаворку
Вядзе сягоння новы час.

Адчынім насцеж дзверы хаты,
Каб вынішчаў дарэшты тлен,
Каб смецце выдзімаў заўзята
Жаданы вецер перамен.

На нас глядзяць,
Нам вераць дзеці,
Якім Радзіму берагчы.
Яны,
нібы рэнтген,
прасвецяць,
Ад іх вачэй куды ўцячы?

Мне чуцен голас:
«Хопіць раны,
Як соллю,
Гаркатой цвяліць.
Сумленне востра,
несціхана
Не ў аднаго цябе шчыміць...»

А я кідаю не каменне
У свой айчынны агарод,
Хачу згадаць,

Што нам найменне —
Не гурт істотаў,
А народ!

Разумна зроблена папраўка,
Даволі ў чад і твань спаўзаць.
У тым жа ўся і сутнасць праўды,
Што трэба ў час яе сказаць.

Ва ўсіх даўно апухлі вушы
Ад пустазвоннай балбатні.
Менш слоў, больш справы.
Мусім зрушыць
Сябе,
Напоўніць працай дні.

І не прыкідвацца,
што згодны,
А сам —
каб як перачакаць.
З такіх нягрэшна прынародна
Штаны працёртыя спускаць.

Мы з душ сагнутых, закарэлых
Цярпліва вытравім раба.
І пойдзем далей
Чэсна,
Смела...
Жыццё —
за праўду барацьба.

Узнімем да святла краіну
І свет
На жылістых руках,
Каб след
пасля сябе пакінуць
Не на пагосце,
А ў вяках.

**Калыска памяці**

Красавіцкую ноч скубанула атрутнае полымя,
Папярхнулася неба ад пылу,
ад змрочнага тхла.
Праз густы першацвет і праз цельцы
пяшчотныя, кволыя
Незаўважная воку нямая бяда папаўзла.
Гэта чорная быль,
што ўзышла над садамі і хатамі,
Чорны боль,
што не хоча ацiхнуць, варочаць на спад,
Разгайдалі Зямлю —
чалавецтва калыску крылатую —
Так, што чуецца спуджаны голас яе немаўлят.
Нават месяц, прыбіты да высяў
на шчасце падковаю,
Пацямнеў, змізарнеў і схаваўся
за навіссю хмар.
Грозны атамны бунт дачакаўся
сляпой выпадковасці,
На жывое абрушыў раптоўны і помслівы ўдар.

Ды знайшлася адвага,
нікім і нічым не выводная,
Застаецца для многіх яна за ўяўлення мяжой...
Лейтэнанты, салдаты —
сыны нашы,
хлопчыкі родныя,
Я малюся на вас скамянелай маўклівай душой.
Сталі чорнай пакутай
бяссонныя, доўгія ночы мне,
І не ўзняць на світанні павіннай сваёй галавы.
За жыццё, за мяне
неймавернай цаною заплочана.
Столькі юнай крыві...
І цяпер маладзенькія — вы.
Спеюць думы імкліва, бунтоўна...
Наскрозь радыяцыя
Пранікае туды,
дзе ўладарыць тупое — не руш!
Бачна ўсім: хто ёсць хто...
Пачынаецца дэзактывацыя
Абыякавых сэрцаў і самаздаволеных душ.
Сёння жыць, як раней, немагчыма,
бо горкай хвілінаю
Пракацілася болю цунамі па звыклым быцці.
Праз дзірван закарузласці
ўпартай зялёнай сцяблінаю
Ці дазволіць нам лёс,
ці пасобіць нам час прарасці?
Я стаю на зямлі спаконвечнай, сваёй,
і не верыцца,
Што варожаю стане яна
для сыноў і дачок,
Тых, чыім нараджэннем,
чыёй апантанаю вернасцю
У наступныя дні скіраваны размашысты крок.
Я цалую вачыма,
крывёю
і нервамі голымі
Кожны кусцік лазовы, травіну, краплiну крыніц.
І на ласку зямля адгукаецца
стомленым голасам,
І захочацца ўпасці ва ўлонне духмянае ніц.
А бяды не адчуеш —
ні паху, ні смаку, ні колеру,
Ды здаецца,
што ўвесь шчасцядайны і крэўны абшар,
Што гарчыць палыном,
трапяткою былінкаю колецца,
На плячах ледзь трымае
жыцця пагрузнелы цяжар.
Не шкадую сябе.
Ад дзяцей хай зямля яе адвернецца.
Толькі б род беларусаў не сцёк,
не схіліўся на звод,
Толькі б вечна ў раллі
прарастала жытнёвае зернятка,
Лашчыў вабнаю мрояй жанчыну
настойлівы плод.
Доля роднай зямлі —
справа першая і запаветная,
www.kamunikat.org

Перад намі — унукі,
за намі — магілы дзядоў.
Мы ўратуем цябе, шматпакутная, гордая,
светлая,
Потам чыста адмыем, не будзе атрутных слядоў.
Чорны боль,
нібы стрэмку,
да скону нам з сэрцаў не выцягнуць,
Ды пагодныя дні зноў плывуць маладой чарадой.
Засталося б жыццё, а астатняе здолеем,
выцерпім,
Толькі б гэта бяда стала нашай
апошняй бядой.
...А над намі, зямлянамі, неба агульнае, сіняе,
Сцен ніякіх між намі — яднае прырода сама.
Сэрцы насцеж дабру,
разуменню
і згодзе расчынены,
А спакою раней не было і сягоння няма.
Чалавечай крыві
і гвалтоўных рабункаў аматары
Выпаўзалі з пячораў
у скурах звярыных даўней.
А куды ж уцячы, дзе схавацца,
як доўбняю атамнай
Біць пачне па зямлі ад улады сп'янелы пігмей?
Не чакаю падзякі і нейкай за гэта авацыі,
Бо і мне б'е пад дых,
як жалезны кулак, адкрыццё,
Што прыйшлі да мяжы,
падышлі да сваёй кульмінацыі,
Сталі побач усе:
Вечнасць,
Век,
Чалавецтва,
Жыццё.
Кружыць грай груганоў
над зялёна-блакітнаю выспаю,
Смерць цікуе,
каб выслізнуць з ядзерных чорных грыбоў...
Дзе ж той сродак, ратунак,
каб выжыць, прад бураю выстаяць?
Гэта памяць народная,
праведны гнеў і любоў!
Там бяда выпаўзае,
дзе шашаль заводзіцца ў памяці,
Там, дзе свеціцца ў ёй:
То прагал,
То правал,
То пралёт.
Покуль кружыць Зямля
і пад сонцам,
і ў зоркавай замеці,
Помні ўсё,
не маўчы,
не маўчы,
чалавечы мой род!

**Зямная малітва**

Зямля мая...
Хану прызнацца шчыра,
Што часам цяжка з болем саўладаць.
Стаў на крыло маіх пагодкаў вырай,
Але прагалаў колькі ў ім відаць.

Ад згадкі стане сіратліва неяк,
Што небыццё нікога не міне,
Што згасне Сонца,
Ты заледзянееш,
Галактыку прадонне паглыне.

Падумаю — і сэрца халадзее,
Але тады насуперак бядзе
Душа пускае парастак надзеі,
Што чалавечы плён не прападзе.

З блакады жорсткай
выйсце знойдзе розум,
Іначшы ход прадбачыць не магу,
Бо нават у бязважкасці варожай
Жыццё сваю не страчвае вагу.

У градалётах і метамарфорах
Працягнецца яно,
І страшным злом
Не скончыцца рывок праз чорны морак,
Пагоня за прасторай і святлом.

Здабытае пакутай неймавернай
Жаданне жыць бясконца
Не засне.
Рукой пазнання скрозь зямное зерне
Рассеецца па зорнай цаліне.

Яно і праз мільярды год прарвецца,
Не згубіцца ў касмічнай немаце
І сілай маладою развінецца
Так, як трыпутнік на цвярдой вярсце.

Наступіць час, калі ў глухім Сусвеце,
На зорках, што таемнасцю мігцяць,
Народзяцца землян адважных дзеці,
Каб спасцігаць вялікі сэнс быцця.

Зямля мая...
Не ўсё шапталі вусны,
Што я хацеў табе адной сказаць.
Ды ведай, што маёй любові вузел
І смерць ніяк не зможа развязаць.

З табой лячу пад знакам Задыяка,
І мне не мінаваць журбы і ўцех —
Не сорамна слязою ціхай плакаць,
Не боязна дарыць каханай смех.

Хвілін сняжыны падаюць,
І спее,
І хутка праграміць гадоў абвал.

Ну, што ж, няхай.
Мне не патрэбна дзея,
Калі вядомы да драбніц фінал.

А ўсё, што перажыў, хоць надта важка,
Парой перамагаючы сябе,
Настойліва,
Упарта, як мурашка,
У новы дзень цягну я на гарбе.

Былога ношка
Плечы мне ўгінае,
Такая доля ў памяці ганца.
Жыццё!
Ты — кульмінацыя скразная
Ад самага пачатку да канца.

І я зямлёй сваю сілкую смеласць,
Ды неспакойны наш агульны дом.
Як ластаўка пад небам пачарнелым,
Трымціць душа, пачуўшы дальні гром.

Што маю на сярэдзіне дарогі,
З якой не саступіць кудысьці ўбок?
Напоўніцы балючае трывогі
І радасці зусім малы драбок.

Груз ядзерны,
Хімічны і нейтронны —
Усё на аднаго, вось і жыві.
А я пад ім такі безабаронны,
Бо плоць мая —
З касцей,
Бялку,
Крыві.

Але пакуль варожасць застаецца,
Жывуць звяры пад маскамі людзей,
Паміж дабром і злом у вечнай спрэчцы
Няма слабых байцоў,
Малых падзей.

Чакаць не варта трапяткога ўзлёту,
Калі ідуць пад кулі, на драты.
Душу патрэбна нагружаць работай,
Якой даць рады можаш толькі ты.

І я ўступіў у тое апалчэнне,
Што прыкрывае белы свет сабой.
Вяду свой бой мясцовага значэння,
Каб не пачаўся ўсёзнішчальны бой.

І я пішу,
Балюча сэрца б'ецца.
Пішу крывёй, не дзеля барыша,
Бо ведаю, што недзе адгукнецца
Маёй душы
Шчымлівая душа.

Мяняць свайго каня на пераправе

Я, хрышчаны бядою, не прывык.
Бо лёс не перапішаш,
Не паправіш,
Як скрэмзаны, цярплівы чарнавік.

Але я веру да апошняй кропкі,
Што нават гэты сціплы мой радок
Абернецца святла патрэбнай кропляй,
Якая дапаможа знішчыць змрок.

Палае час,
Ён апякае пальцы,
Вядзе далей змлелую руку.
Наперадзе ідзе праз сэрца памяць,
І кожны крок не ў след — па цаліку.

Пішу, а за акном завеі ўсплёскі,
Ды мне відно і ў цемені начной.
Уся планета — гарады і вёскі
Як на далоні
Зараз прада мной.

Далёкі Усход ажыў,
Там людзі ўсталі.
Еўропа змогла ціхне спакваля...
Жабрак у Рыме спіць на п'едэстале,
З якога час змахнуў і караля.

Паклаў пад галаву свае манаткі,
Паставіў чаравікі наўскасяк,
І свеціць чалавецтву голай пяткай —
Сюжэт не для рэкламы.
Гора знак.

Над Ронай ліхтароў няяркі плюскат,
Ліёнскі дождж змывае пыл з акон.
Жанет прыціхла з лялькай беларускай,
Закалыхаў яе глыбокі сон.

І ты згадаеш з памяццю ў саюзе
Адну з жыццёвых радасных прыкмет —
Яшчэ спяваюць пеўні ў Сіракузе,
І роднай вёскай раптам здасца свет.

Але не дрэмлюць грозныя ракеты
Пад коўдрай акіянскай і зямной,
Варочаюцца ў чэраве планеты
І колюцца драпежнасцю дурной.

Дык што?
Смуродны пах апошняй бойні
Ці чысціню душы,
Паветра,
Рэк,—
Што, чалавецтва, возьмеш у ссабойку,
Каб з ёй ступіць у дваццаць першы век?

Хоць, кажуць, раніца мудрэй, чым вечар,
Рашай — жыццё пастаўлена на кон.
Хай слова скажа ўсезямное веча,

www.kamunikat.org

Яго сумлення непадкупны звон.

Зямля мая...
Світанні, і змяркanні,
І дзень клапотны,
Звонкі,
Нібы медзь...
Што б ні было, а наша існаванне
Усё-ткі сэнс навечна будзе мець.

Калі прастора зладзіць пераразовы,
Мінулае ў адну ссукае ніць,
То родны гук маёй балеснай мовы
Яшчэ з цымбалаў часу празвініць.

І недзе там —
У вэрхале і гуле —
Камусьці зачаруе слых і зрок
Журботны голас шэрае зязюлі
І спаконвечны сіні васілёк.

І, можа, я крылатаю пылінкай,
Вярнуўшыся з няведамых дарог,
Прылягу на знаёмую сцяжынку,
Што матчын абцалоўвае парог.

Я цвёрда веру ў шлях кругазваротны —
Жыццё нічым не знішчыць, ні забіць.
І нават час бяссільна і самотна
Перад маёй адвагаю стаіць.

Адвагі гэтай ёсць свая прычына,
Далоні долі чую на плячах.
Раптоўная,
Як першы снег,
Айчына
Святлом высокім
Паўстае ў вачах.

Красуй,
Зямля,
У залацістых промнях
І чалавечай мудрасцю сталей...
А мы павінны жыць,
Любіць і помніць,
Павінны помніць, каб ляцець далей.

*Верасень 1985 — май 1986 гг.*

www.kamunikat.org

ЗМЕСТ

СВЕДЧУ ЛЁСАМ (вершы)
*** Мы сцежкай дзён сваіх
*** Адшчыраваў пчаліным звонам ліпень...
Вечная далеч
*** Ад ліўня пачарнелі стрэхі хат
Перакур
*** Званок сярод ночы
Навальніца
*** Усё было
*** Гарацъ чырвоныя каліны
Час падлёту
Рэха маўчання
Касцёр
*** Гады аблятаюць, як лісце
Акно на пятым паверсе
Пра паэзію
Над полем вечнага чарнавіка
*** Я не вымольваў слоў пяштотных...
Крык нараджэння
*** Хвароба, смутак, радасны настрой
Сутнасць
КУЛЬМІНАЦЫЯ (паэма)

Законнікаў С.
Сутнасць: Кн. паэзіі.— Мн.: Маст. літ.,
1987.- 95 с: іл.

Новая кніга паэта перадае дынамізм і складанасць нашага часу, напоўненага клопатам пра росквіт роднай зямлі, Айчыны, пра лёс усяго чалавецтва. Сама назва кнігі вызначае шырыню і сур'ёзнасць размовы з чытачом. У вершах ідзе напружаны лірычна-філасофскі роздум над пытаннямі быцця чалавека.

Паэма «Кульмінацыя» ўзнімае вострыя маральныя і грамадскія праблемы, у ёй на поўны голас гучыць усхваляванае слова паэта ў абарону міру.

© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год